**Напярэдадні XIX Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" некалькі дзён запар мы спрабавалі, як кажуць, заспець на месцы сусветна вядомага спевака, народнага артыста Расіі Дзмітрыя ХВАРАСТОЎСКАГА. Графік артыста надзвычай шчыльна напоўнены падзеямі (скажам, літаральна за пару дзён да прыезду ў фестывальны Віцебск знакаміты барытон выступаў у казахскай сталіцы Астане). Таму і не дзіва, што электронны ліст ад мэнеджэра спевака са словамі: "Чакаем вашага тэлефанавання сёння ў 12.40" мы атрымалі акурат у дзень здачы нумара ў друк.**



**— Дзмітрый Аляксандравіч, на віцебскім форуме мастацтваў вы прадставіце сваю праграму пад акампанемент Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь. З гэтым калектывам вы ўжо выступалі летась у сталічным Палацы спорту. Якія ўражанні ад сумеснай працы?**

— Уражанні — надзвычай прыемныя. Прэзідэнцкі аркестр Беларусі, на маю думку, — вельмі добры малады калектыў, які літаральна выпраменьвае станоўчыя эмоцыі пры выкананні сусветнай класікі. І (можа, праз свой узрост) музыканты — надзвычай захопленыя. Прычым захапленнем гэтым немагчыма не запаліцца і самому! А ўвогуле, Беларусь наведваю пастаянна, і ўражанні заўжды — самыя добрыя.

**— Дзмітрый Хварастоўскі, па ўсім, — чалавек стыльны, прычым як у музыцы, так і ў паўсядзённасці. А прытрымлівацца свайго непаўторнага стылю ў жанры, у якім вы працуеце, — адна з найпершых зарук поспеху. Якімі прынцыпамі кіруецеся ў мастацтве і ў жыцці?**

— Гранічная натуральнасць — прынцып найпершы і, адпаведна, найважнейшы. У мастацтве гэта — галоўнае: менавіта такім чынам артыст ідзе да гледача і слухача, дасягаючы глыбіні яго душы праз мастацтва. Калі паміж спеваком і публікай узнікае суперажыванне, разуменне і спачуванне да героя таго або іншага вакальнага твора, тады падобны кантакт і ўстанаўліваецца.

**— Ведаю, што апошнім часам у вашы канцэртныя праграмы ўваходзяць песні гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Ці пачуе іх віцебскі слухач?**

— Франтавыя песні, творы пасляваенных гадоў — адна з найярчэйшых старонак, — а сёння можна казаць і пра традыцыю, — у нашай культуры. Не выпадкова яны ўзніклі і ў маім рэпертуары, бо цесна звязаны з Памяццю народа, дзе, мусіць, няма той сям'і, якую не абпаліла б крыло пажарышчаў і баёў Вялікай Айчыннай. І я здзіўляюся штораз той рэакцыі, якую бачу ў гледачоў не толькі ў Беларусі, Расіі або Украіне, але і на Захадзе: пасля выканання "франтавой праграмы" людзі ў Лондане або іншым еўрапейскім горадзе ўстаюць і апладзіруюць, не стрымліваючы слёз. У іх, на маю думку, закладзены код болю, код перажывання і суперажывання. А гэтыя пачуцці, я, мабыць, паўтаруся, — рухавік многіх рэчаў. Не шкадую, што ўключыў гэтыя песні ў свой рэпертуар, прычым, паверце, не толькі ў сувязі са святкаваннем 65-годдзя Вялікай Перамогі. Канешне ж, прадстаўлю іх з задавальненнем і віцябчанам.

**— Чым яшчэ здзівіце патрабавальных гледачоў фестывалю?**

— Акрамя ваенных песень, выканаю праграму рускіх рамансаў.

**— Ведаю, што найбліжэйшыя вашы выступленні пасля "Славянскага базару ў Віцебску" пройдуць на іншых фестывалях: у Вероне і Празе. Якія канцэрты вам наогул больш падабаюцца: пад адкрытым небам, у вялікіх залах або ў камернай абстаноўцы?**

— Ведаеце, усё залежыць ад настрою. А разнастайнасці і сапраўды хапае. Скажам, у Вероне я выканаю партыю Трубадура ў аднайменнай оперы Джузэпэ Вердзі, а ў Празе выступлю якраз у камерным канцэрце пад акампанемент раяля. У Віцебску мяне чакае аркестр. Думаецца, што сапраўднае мастацтва — гэта яшчэ і ўменне заставацца розным.

С.Т.

# Дзмітрый ХВАРАСТОЎСКІ, народны артыст Расіі:

Hvorostovsky.org

# Уменне заставацца розным

## Разам і паасобку

**Прэзідэнцкі аркестр Беларусі выступае на сёлетнім "Славянскім базары ў Віцебску" ў розных іпастасях. Салісты калектыву, што ў свой час сталі пераможцамі тэлепраекта "Новыя галасы Беларусі", прэзентуюць песню Сяргея Сухамліна "Мы разам" у гала-канцэрце адкрыцця фестывалю. Група "3 + 2", складзеная з нашых салістаў, удзельнічае ў канцэрце "Зоркі "Еўрабачання" на плошчы Перамогі. У суправаджэнні ж аркестра, за дырыжорскім пультам якога ў той вечар будзе Канстанцін Арбелян, у Летнім амфітэатры пройдзе сольны канцэрт Дзмітрыя Хварастоўскага, прымеркаваны да фестывальнага Дня Расіі.**

— З Дзмітрыем Хварастоўскім, — сказаў галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік Прэзідэнцкага аркестра Беларусі Віктар Бабарыкін, — наш калектыў выступаў некаторы час таму ў Мінску. І вельмі прыемна, што гэты цудоўны артыст і бліскучы спявак зноў абраў наш аркестр: гэта сведчанне высокага прафесійнага ўзроўню нашых музыкантаў і, шырэй, беларускай выканальніцкай школы. Праграму мы рыхтавалі з асаблівымі пачуццямі і любоўю: выступаць з такім салістам — радасць для кожнага аркестранта. Дарэчы, у песнях ваенных гадоў, што таксама ўвойдуць у фестывальнае выступленне Дзмітрыя Хварастоўскага, неабходны баян, і мы запрасілі лаўрэата міжнародных конкурсаў, знакамітага беларускага саліста Аляксандра Шувалава, які даўно супрацоўнічае з нашым аркестрам.

Дмитрий Хворостовский, народный артист России:

Умение оставаться разным

**Накануне XIX Международного фестиваля искусств "Славянский базар в Витебске" мы несколько дней подряд пытались, как говорится, поймать всемирно известного певца, народного артиста России Дмитрия Хворостовского. График артиста чрезвычайно насыщен событиями (например, всего за пару дней до прибытия на фестиваль в Витебск знаменитый баритон выступал в столице Казахстана Астане). Поэтому неудивительно, что в день сдачи номера в печать мы получили письмо от менеджера певца со словами: «Ждём вашего звонка сегодня в 12:40».**

**- Дмитрий Александрович, на Витебском форуме искусств вы представите свою программу в сопровождении Президентского оркестра Республики Беларусь. В прошлом году вы выступали с этим коллективом в столичном Дворце спорта. Какие у вас остались впечатления от работы с ним?**

-Впечатления очень приятные. Президентский оркестр Беларуси, на мой взгляд, прекрасный молодой ансамбль, который буквально излучает положительные эмоции при исполнении мировой классики. И (возможно, из-за своего возраста) музыканты невероятно увлечены. Невозможное не поддаться их энтузиазму! А вообще, Беларусь посещаю я постоянно, и впечатления всегда - самые хорошие.

**- Дмитрий Хворостовский, по общему мнению, стильный человек, как в музыке, так и в повседневной жизни. А следование своему уникальному стилю в жанре, в котором вы работаете, - один из самых верных путей к успеху. Какими принципами вы руководствуетесь в искусстве и в жизни?**

Прежде всего и самый важный принцип - это предельная искренность. В искусстве это имеет первостепенное значение: именно благодаря этому качеству артист трогает глубины души зрителя через своё искусство. Когда между певцом и зрителем устанавливается связь, сопереживание, понимание и симпатия к герою конкретного вокального произведения, тогда такой контакт устанавливается.

**- Знаю, что в последнее время в ваших концертных программах звучат песни военных лет. Услышит ли их слушатель в Витебске?**

- Фронтовые песни, произведения послевоенных лет - одна из самых ярких страниц, и сегодня мы можем говорить о традиции в нашей культуре. Не случайно они вошли в мой репертуар, ведь они тесно связаны с памятью народа, наверное, нет семьи, которую не коснулись сражения и пожары Великой Отечественной войны. Меня поражает одинаковая реакция зрителей не только в Беларуси, России или Украине, но и на Западе: после показа «откровенной» программы люди в Лондоне или другом европейском городе встают и аплодируют, не в силах сдержать слёз. По моему мнению, в этих песнях заложено чувство боли, эмоции и сопереживания. И эти чувства, возможно, я повторяюсь, являются движущей силой многих вещей. Не жалею, что включил эти песни в свой репертуар, и поверьте, не только в связи с празднованием 65-летия Великой Победы. Конечно, я с удовольствием исполню их и для жителей Витебска.

**- Чем ещё удивите взыскательную публику фестиваля?**

Помимо военных песен я исполню программу русских романсов.

**- Ваши следующие выступления после «Славянского базара в Витебске» состоятся на других фестивалях в Вероне и Праге. Какие концерты вам вообще больше нравятся: под открытым небом, в больших залах или в камерной обстановке?**

- Знаете, всё зависит от настроения. А разнообразия и аккомпанемента хватает. Например, в Вероне я буду исполнять роль Трубадура в одноименной опере Джузеппе Верди, а в Праге выступлю в камерном концерте в сопровождении фортепиано. В Витебске я буду выступать с оркестром. Я считаю, что настоящее искусство – это еще и умение оставаться разным.

**Вместе и по отдельности**

**Президентский оркестр Беларуси выступает на нынешнем «Славянском базаре в Витебске» в различных составах. Солисты оркестра, которые в своё время стали победителями телевизионного проекта «Новые голоса Беларуси», представляют на гала-концерте открытия фестиваля песню Сергея Сухомлина «Мы вместе». Группа «3+2», составленная из наших солистов, принимает участие в концерте «Звёзды Евровидения» на площади Победы. В сопровождении оркестра, за пультом которого в тот вечер будет Константин Орбелян, в Летнем амфитеатре в рамках Дня России на фестивале пройдёт сольный концерт Дмитрия Хворостовского.**

- С Дмитрием Хворостовским, - сказал главный дирижер и художественный руководитель Президентского оркестра Беларуси Виктор Бабарыкин, - наш ансамбль выступал в Минске некоторое время назад. И очень приятно, что этот замечательный артист и блестящий певец снова выбрал наш оркестр: это свидетельствует о высоком профессиональном уровне наших музыкантов и, в более широком смысле, о белорусской школе исполнительского искусства. Мы подготовили программу с особым чувством и любовью: выступление с таким солистом - радость для каждого участника оркестра. Кстати, для песен военного времени, которые также будут включены в фестивальную программу Дмитрия Хворостовского, необходим баян, и мы пригласили лауреата международных конкурсов, известного белорусского солиста Александра Шувалова, который давно сотрудничает с нашим оркестром.

Перевод с белорусского Неофициальный сайт Дмитрия Хворостовского

Hvorostovsky.org
Hvorostovsky.org